Матыліцкая Н. В.

## СТАН КУПАЛЬСКАЙ ТРАДЫЦЫІ НА СЛУЧЧЫНЕ: фактары захавання і аслаблення

Стан купальскай традыцыі на Случчыне[1] можна ахарактарызаваць як нераўнамерны. Нераўнамернасць гэтая датычыць ступені захаванасці купальскага абраду і песень у розных зонах гэтага мікрарэгіёна. Захаванасць купальскай традыцыі рэзка кантрастуе з захаванасцю іншых каляндарна-абрадавых традыцый у гэтым жа мікрарэгіёне, напрыклад, з традыцыяй калядавання і валачобніцтва, якія носяць даволі раўнамерны (паўсямесны) характар. Купальская традыцыя на тэрыторыі Случчыны не мае паўсямеснага характару, бо вылучаюцца зоны, у якіх не захавалася згадак пра існаванне гэтай традыцыі.

Можна вылучыць некалькі ступеняў, якія характарызуюць захаванасць купальскай традыцыі, пачынаючы ад найлепшай захаванасці купальскага абраду і песень і заканчваючы іх поўнай адсутнасцю: 1 ступень — фіксацыя купальскага абраду і песень; 2 — фіксацыя толькі купальскага абраду; 3 — фіксацыя асобных элементаў купальскага абраду, напрыклад, варажбы; 4 — фіксацыя адсутнасці абраду і песень.

1 ступень уласціва пераважна для заходніх раёнаў Случчыны — частка Ляхавіцкага, Нясвіжскі і Клецкі, дзе купальская традыцыя фіксавалася фалькларыстамі, як XIX, так і XX ст..

Дарэчы, на картах распаўсюджання купалькіх песенных тыпаў, створаных этнамузыколагам Г. Таўлай, тэрыторыя заходняй Случчыны (Нясвіжскі, Клецкі, Ляхавіцкі раёны) адносіцца да купальскага песеннага тыпу 1, які ахоплівае самую вялікую тэрыторыю Беларусі.

Мы мяркуем, што да гэтага ж тыпу можа адносіцца тэрыторыя Капыльскага і поўнач Слуцкага раёнаў, гэта крайнія раёны на абазначанай этнамузыколагам зоне. На жаль, мы можам толькі меркаваць, бо карты схематычныя: раёны на іх не пазначаны. У навуковым артыкуле, да якога адносяцца карты, з рэгіёна, які нас цікавіць дакладна называецца толькі Клецкі раён, які характарызуецца побач з некаторымі іншымі (поўнач Крупскага, Баранавіцкі, Чашніцкі, Полацкі, Горацкі, Жлобінскі, Пінскі), што адносяцца да гэтага ж тыпу, «найбольшай інтанацыйнай і рытмічнай унутрыскладовай раскаванасцю» (7, с. 40), што безумоўна, сведчыць пра меладычную адметнасць гэтага арэалу.

Астатняя тэрыторыя Случчыны (Слуцкі, Салігорскі, Капыльскі, Любанскі раёны) засталіся на карце не абазначанымі, што нібыта павінна

[1] Мікрарэгіён Случчына ўключае ў сябе Слуцкі, Капыльскі, Клецкі, Нясвіжскі, частку Салігорскага, Любанскага і Ляхавіцкага раёнаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абазначаць адсутнасць купальскай традыцыі. Але гэта не так. Узоры купальскіх песень, запісаныя на гэтай тэрыторыі нешматлікія, але тым не менш яны сведчаць пра існаванне традыцыі. На гэтай частцы Случчыны пераважна сустракаюцца, 2, 3 і 4 ступені захаванасці, больш рэдка 1.

Асаблівую ўвагу хочацца звярнуць на тэрыторыю Слуцкага раёну, дзе купальская традыцыя захавалася найгорш. У большасці вёсак (паводле звестак экспедыцый аўтара артыкула 1990, 1992, 2007 гг.) Слуцкага раёна зафіксавана 3 і 4 ступень захаванасці. Напрыклад, у в. Боркі памятаюць, што на Купалле ў 12 гадзін ночы дзяўчаты заўсёды варажылі: «Зрывалі тропатнік (трыпутнік, заўв. аўт.) зубамі тры разы, не згінаючы каленяў і прыгаворвалі: «Тропатнік, галубчык мой, ты расцеш пры дарозе і ўсіх знаеш, скажы мне: з кім я буду век векаваць? Так паўтаралі тройчы. Тады клалі тропатнік за пазуху і беглі да хаты. Па дарозе нельга ні з кім было размаўляць, нельга, каб рассмяшыў хлопец, бо яны хаваліся і назіралі за дзяўчатамі. Клаліся спаць — ноччу павінен быў прысніцца суджаны» (2).

На тэрыторыі Слуцкага раёна навідавоку купальская традыцыя знікае, характэрнымі для раёна з'яўляюцца словы інфармантаў: «Купалле ва Ушаловічах святкавалі», але не могуць узгадаць як.

Купальскія песні зафіксаваны ў некаторых «запаведных» мясцінах: на поўначы раёна, у прылеглай з Уздзенскім раёнам тэрыторыяй: в. Азерцы, Белая Лужа, Замосце і ў некаторых вёсках усходняй часткі раёна — Прошчыцы, Мялешкі, Папоўцы.

Мы тут ушчыльную падыходзім да высвятлення фактараў, якія спрыялі захаванасці гэтай традыцыі ў абазначаных «запаведных» месцах.

«Экалагічны фактар», па вызначэнні ангельскага этнолага доктара Джонса выяўляецца, напрыклад, у адрозненнях паміж традыцыйнымі культурамі сялян горных раёнаў і раўнін: «як горы яшчэ далёка не заваяваныя, так яны яшчэ далёка не цывілізаваныя» і захоўваюць традыцыйныя звычаі даўжэй за раўніны» (1, с. 57).

Мы лічым, што можна экстрапаляваць гэтую ідэю на экалагічныя ўмовы Случчыны, з той розніцай, што кантраст умоў тут крыху іншы — паміж раўнінамі і лесам з поўначы, раўнінаю і балотам з поўдня. Мы сцвярджаем, што ў населеных пунтах у лясных і забалочаных зонах, дзе менш доступу для пранікнення цывілізацыі лепш захавалася каляндарнаабрадавая традыцыя, у тым ліку і купальская. Напрыклад, в. Азерцы на поўначы Слуцкага раёна размешчана сярод лесу і ў далечыні ад вялікіх дарог, таму ў адрозненне ад суседніх в. Гацук і Белая Вежа, якія размешчаны пры вялікай шашы Слуцк—Мінск, захавала больш поўны набор купальскіх песень.

Гэтую ж уласцівасць заўважыў яшчэ ў канцы XIX ст. збіральнік фальклору П. Бывалькевіч. У в. Вуглы Слуцкага павета (цяпер Капыльскі раён)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нарыс «Іван Купала» (1891 г.) у «Этнографическом сборнике» аўтар робіць каштоўнае назіранне пра прычыны захаванасці абраду Купалля менавіта ў гэтай вёсцы: «Вёска Вуглы ў той час уяўляла сабой адзінае месца (з усіх суседніх вёсак) у Слуцкім павеце, дзе яшчэ захоўваўся старажытны звычай святкавання Купалы. Яна стаяла ў баку ад вялікіх дарог» (6, с. 399).

І. Сербаў у пачатку XIX ст. адзначае большую цывілізаванасць Случчыны ў параўнанні з суседняй тэрыторыяй і падкрэслівае залежнасць ад гэтага фактару захаванасці традыцыйнай культуры. Жыхароў Случчыны ён называе палянамі, а жыхароў часткі сучаснага Старадарожскага раёна — сакунамі: «На паўночны-ўсход цягнецца чысцейшая Дрыгава з вядомымі паселішчамі Дражынам і Жыцінам і інш., якія выдатна захавалі прыкметы старажытнай культуры, тады як на паўднёвы-захад на Палях усё старое надзвычай хутка выцясняецца новым як у пабудовах, так і ў адзенні» (8, с. 77).

Што датычыць поўдня мікрарэгіёна, дзе раўніна кантрастуе з забалочанай мясцовасцю, лічым зноў жа не выпадковым, што купальскія песні і абрад зафіксаваны ў аддаленых і забалочаных вёсках Салігорскага раёна, у т. зв. «палескай зоне» Случчыны — Доўгае, Скаўшын, Ананчыцы, Добрая Лука, Вялікі Рожан.

Другім, акрамя «экалагічнага фактару», як мы бачым, значнага ў захаванні традыцыі, з'яўляецца «сацыяльны фактар». Гэты фактар, з пэўнымі варыяцыямі, з'яўляецца універсальным для ўсіх народаў, бо як заўважыў ангельскі даследчык Кодай «заможныя любілі аддзяляць сябе ад беднейшых нават у сваіх песнях» (1, с. 57).

У дачыненні да яго ўплыву на традыцыю ў мікрарэгіёне Случчына гэта выяўляецца ў дзвюх тэндэнцыях.

1-я тэндэнцыя — імкненне жыхароў шляхецкіх паселішчаў (засценкаў, фальваркаў) да адрознення з жыхарамі сялянскіх паселішчаў. Гэта выявілася ў адрозненнях гаворкі, адзення і ў тым ліку ў адносінах да захавання фальклорнай традыцыі.

Вось толькі адзін з фактаў, як выяўляліся гэтыя адрозненні: «У нашай вёсцы Дунцы Любанскага раёна жыла шляхта, гаварылі «слуцкая шляхта», а вёскі побач Цярушкі (Салігорскі раён) і Закальное (Любанскі раён) людзей іх называлі «палешукі», або «мужыкі». Адзяваліся яны пасвойму: спадніца ў зборкі, у папярэчныя палоскі. Іх падражнівалі за вочы і за адметнасці ў гаворцы: «Здаецьце на балоце гусь нясецьце». Але ў іх спявалі старыя песні, напрыклад, на Каляды: «О, ужо палешукі завялі, заспявалі» (3).

У выніку, гэтае імкненне да адрознення прывяло да аслаблення фальклорнай традыцыі ў шляхецкіх паселішчах, а што датычыць канкрэтна каляндарна-абрадавай традыцыі, то яна была ўвогуле амаль

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цалкам выцеснена. Так, у в. Боркі Слуцкага раёна, вёска раней была шляхецкім засценкам, ад Гузоўскай Г. удалося запісаць вялікую колькасць традыцыйных песень, але ўсе яны пазаабрадавыя, з абрадавых «ацалелі» толькі вясельныя песні. Яна таксама гаварыла, што шляхта насміхалася з гаворкі «мужыкоў», з іх «сакання» (традыцыйная адметнасць у дыялектнай гаворцы Жыхароў Случчыны): «Наеласа, напіласа і ў разору пакаціласа» (2).

А між тым у суседніх з вв. Боркі, Шулякі, Кухты і Ушаловічы, якія не з'яўляліся шляхецкімі, нам удалося запісаць узоры каляндарна-абрадавых песень — валачобных, веснавых, жніўных. Інфармантка Яніна Лунёва з Борак успамінала: «Хлопцы з Кухтаў хадзілі са звяздою. Нашыя — Баранцэвіч, Андрусэвіч, Гузоўскі, Балвановіч шляхта былі, яны не хадзілі» (4).

2-я тэндэнцыя ўплыву сацыяльнага фактару на фальклорную традыцыю, звязана з «рэлігійнай» свядомасцю жыхароў.

1. У той жа в. Боркі, каталіцкага веравызнання Я. Лунёва адзначае, што «каляды ў нас спявалі па-польску» (4). Такім чынам, даўнейшая традыцыя выканання традыцыйных калядных песень была заменена на спевы касцельных песень хрысціянскай тэматыкі.

2. У в. Сярэднікі Слуцкага раёна, вельмі набожныя жанчыны, праваслаўнага веравызнання, выказаліся, што не спяваюць купальскіх песень і не адзначаюць абраду, бо лічаць гэта вядзьмарствам. А ў в. Сярэднікі інфармант таксама адзначыў свае негатыўныя адносіны да Купалля: «Купалле было ў нас не ў пашане. Калі скажаш пра яго — людзі ўзгадваюць ведзьмаў, а ў нас людзі набожныя» (5). Вёскі Сярэднікі і Сярагі знаходзяцца недалёка ад гораду Слуцку, вядомага гістарычна сваімі моцнымі традыцыямі праваслаўя. Мы выказваем меркаванне, што гэтая акалічнасць магла паўплываць на большую рэлігійнасць жыхароў блізляжачых населеных пунктаў і як вынік на фарміраванне іх негатыўнага стаўлення да архаічнага язычніцкага абраду, які быў звязаны з вераю ва ўзмацненне вядзьмарства менавіта ў гэты час. Магчыма, гэты негатыў бярэ вытокі і цягнецца яшчэ з часоў т. зв. «палявання на ведзьмаў». Але гэта толькі гіпотэза, якая патрабуе дадатковых аргументаў. Тым не менш, жыхаркі вёскі Сярагі не звязваюць ніякага негатыву з іншымі каляндарнымі жанрамі і таму спяваюць традыцыйныя калядныя, і жніўныя песні, а побач з імі спяваюцца таксама песні хрысціянскай тэматыкі на тых жа святах, напрыклад, на калядны.

З параўнання гэтых двух выпадкаў, відавочна, што ў паселішчах з жыхарамі праваслаўнага веравызнання каляндарна-абрадавыя традыцыі захаваліся лепш, бо тут народная і хрысціянская традыцыі пераважна ўзаемадзейнічаюць на прынцыпах суіснавання, а ў каталіцкім асяродку — на прынцыпе ўзаемавыключэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, купальская традыцыя на тэрыторыі Случчыны не мае паўсямеснага характару. Вялікую ролю ў яе захаванні, або аслабленні, як мы прааналізавалі, адыгралі «экалагічныя» і «сацыяльныя» фактары, якія ў мікрарэгіёне Случчына маюць сваю спецыфіку.

Літаратура


1. *Бэрк П.* Народная культура Эўропы ранняга Новага часу / Пер. з англ. І. Ганецкай; Пад рэд. А. Ліса. Мн., 1999.
2. Зап. Н. В. Матыліцкая ў 1990 г. у в. Боркі Слуцкага раёна ад Гузоўскай Г. М., 1911 г. н.
3. Зап. Н. В. Матыліцкая ў 1998 г. ад Загорскай В. М., 1937 г. н. (нарадз. у в. Дунцы Любанскага раёна, цяпер жыве ў г. Мінску).
4. Зап. Н. В. Матыліцкая ў 1992 г. у в. Боркі Слуцкага раёна ад Лунёвай Я. А., 1912 г. н.
5. Зап. Н. В. Матыліцкая ў 2007 г. у в. Сярэднікі Слуцкага раёна ад Шпака С. Л., 1969 г. н.
6. Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / Уклад., класіф., сістэм. матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага; Мн., 1990, с. 399.
7. Купальскія і пятроўскія песні / Уклад. А. С. Ліса, С. Т. Асташэвіч. Мн., 1985.
8. Поездка по Полесью летом 1912 г. И. А. Сербова / Записки Северо-Западного отдела Русского географического общества. Кн. 4. 1914.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ